# ...і крыху сонца ц халодным студзені

У самым канцы мінулага года ў сталічнай галерэі "Універсітэт культуры" пачалі працаваць адразу дзве выставы: "Лета ў правінцыі" і "Бабруйскі варыянт". Абсалютна розныя і па тэматыцы, і па стылістыцы, і нават на жанрава-відавым узроўні (у адной экспазіцыі — жывапіс, у другой — кераміка), яны ўсё ж маюць адну істотную кропку перасячэння: абедзве народжаны летам, сонцам, гарачынёй...

"Лета ў правінцыі" (так называецца першая выстава) — гэта плён работы ўдзельнікаў арт-пленэра, які сёлета быў арганізаваны аддзелам культуры Смалявіцкага райвыканкама пры падтрымцы грамадскай арганізацыі "Беларускі зялёны крыж". Пленэр аб'яднаў маладых мастакоў, якія выкладаюць у мастацкіх школах, гімназіях, а таксама вышэйшых навучальных установах. Праект даў магчымасць творчым асобам, якія плённа займаюцца педагагічнай дзейнасцю, рэалізаваць свой творчы патэнцыял і падзяліцца вопытам з калегамі. У поле зроку ўдзельнікаў пленэра трапілі вёскі Алесіна і Каменка Смалявіцкага раена, а таксама адметныя вулачкі самога мястэчка Смалявічы.



А.Ткачоў. Singer ("Бабруйскі варыянт").

"Бабруйскі варыянт" (другая выстава) прэзентуе творчасць чатырох мастакоў-керамістаў з Бабруйска, два з якіх належаць да старэйшага пакалення — Валерый Калтыгін і Анатоль Концуб — і два — да маладзейшага — Алег Ткачоў і Максім Калтыгін. Зрэшты, усе чацвёра аднолькава шчыра ўлюбёны ў мастацтва керамікі і ў міжнародны пленэр па кераміцы "Арт-Жыжаль", які штолета праходзіць у Бабруйску і на якім мастакі напружана, з вялікім імпэтам і самаадданасцю працуюць некалькі тыдняў у сумеснай творчасці з "жывым" агнём.



В.Калтыгін. З серыі "Літары" ("Бабруйскі варыянт").

...Сталічная Кастрычніцкая плошча ў гэтыя навагоднія дні — быццам нейкая казачная выспа шчасця і спакою. Сюды можна прыйсці разам з дзецьмі, павучыць іх катацца на каньках, пасадзіць на поні, даць паздароўкацца з пацешнымі няўклюднымі чалавекападобнымі "зайцамі", якія толькі і ловяць зручнага моманту, каб з імі сфатаграфаваліся мінчане. Можна прыйсці і аднаму. Стаць паблізу невялікага гандлёвага рада з сувенірамі ды глінтвейнам і, паволі пасёрбваючы духмяна-гарачы напітак, сузіраць усю гэтую чалавеча-поні-зайчыную мітусню...

Галерэя "Універсітэт культуры" тут жа, на Кастрычніцкай.

Так блізка яны ніколі не былі — гарадская зіма і правінцыяльнае лета...

**Мікола ЧЭМЕР.**



Работа Н.Камінскай ("Лета ў правінцыі").



Работа Д.Барсукова ("Лета ў правінцыі").

**Фота аўтара.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ